**Л. Г. БАРАНОЎСКАЯ**
(Магілёў)

# Выхаванне пачуцця эмпатыі ў дзяцей пры вывучэнні мастацкай анімалістыкі ў VI класе (на прыкладзе апавядання «Алені» І. Пташнікава)

Прадмет «Беларускай літаратура» ў сярэдняй школе выконвае важную ролю ў фарміраванні светапогляднай і маральна-этычнай арыентацыі вучняў. Разам з адукацыйнымі ставяцца задачы выхаваўчага характару. У адпаведнасці з сучаснай канцэпцыяй літаратурнай адукацыі настаўніку-філолагу неабходна адыходзіць ад пазіцыі сацыялагізатарства і большую ўвагу звяртаць на фарміраванне глыбока гуманістычнага і дэмакратычнага светапогляду на прыкладзе твораў слоўнага мастацтва.

Гэты працэс мае паэтапны характар: засваенне суб'ектам культурных дасягненняў грамадства і праявы іх ва ўласнай сістэме каштоўнасных арыентацый. На сучасным этапе, на жаль, гэтая дуалістычнасць разбураецца, асабліва пры перадачы сацыяльнага вопыту. Звернем увагу на тое, што гэты працэс ажыццяўляецца двума спосабамі: па-першае, неўсвядомлена на пачуццёвым узроўні, па-другое, праз візуалізацыю вербальнымі сродкамі. Сёння перавага аддаецца апошняму, што вядзе да духоўнага спусташэння і механізацыі ўспрыняцця свету, супярэчыць традыцыйным ідэалам беларускага народа. У кантэксце выхаваўчай і ідэалагічнай работы асобае месца надаецца фарміраванню пачуцця эмпатыі ў школьнікаў сярэдняй ступені.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Эмпатыя разумеецца намі як спасціжэнне эмацыянальнага стану, праецыраванне чужога адчування на сябе. Эмпатыя заснавана або на механізме праекцыі і імітацыі маторных і афектыўных рэакцый другога чалавека, або на інтэлектуальных працэсах (такіх, напрыклад, як аналогія, параўнанне і інш.), або на механізме прадчування рэакцыі іншых людзей. У працэсе эмпатыйнага перажывання чалавек атаясамлівае сябе з аб'ектам перажывання або накладвае яго эмоцыі на ўласны эмацыянальны стан. Эмпатыя звязана з паняццем «разуменне». Пры гэтым адбываецца своеасаблівае замыканне выключна на пачуццёвым узроўні, у той час як разуменне ўвогуле ўключае ў сябе як пачуццёвы, так і разумовы ўзроўні.

Выхаванне эмпатыі як гуманістычнага пачуцця ў школьнікаў асабліва добра ажыццяўляць на ўроках літаратуры па вывучэнні твораў, прысвечаных тэме «чалавек і прырода».

У беларускай літаратуры адносіны чалавека са светам жывога з'яўляюцца адной з галоўных ідэйна-філасофскіх і маральна-этычных тэм. Мае рацыю В. Козіч, якая адзначае: «Узаемапаразуменне персанажа з прыродай сведчыць пра духоўна багатую натуру, пра здольнасць адчуваць мудрасць жыцця, прыроды. Творы так званай экалагічнай тэматыкі б'юць у званы ад таго, што насоўваецца на чалавецтва экалагічная катастрофа» [4, с. 3].

Беларускія пісьменнікі актыўна падключаны да асэнсавання вострасучаснай праблемы «чалавек і яго адносіны да прыроды», якая звязана з выхаваннем экалагічнай культуры. У творах такога зместу выкарыстоўваюцца анімалістычныя вобразы. А. Бельскі адзначае: «Свет фауны ў беларускай паэзіі — гэта ў значнай ступені люстэрка духоўнасці асобы, увасабленне яе экалагічных поглядаў і маральна-гуманістычных перакананняў» [2, с. 28].

Сярод твораў школьнай праграмы па беларускай літаратуры актуальнымі ў кантэксце нашага даследавання з'яўляюцца прапанаваныя для чытання і вывучэння ў VI класе творы, у якіх сустракаюцца анімалістычныя вобразы.

Так, пры аналізе апавядання І. Пташнікава «Алені» асобую ўвагу трэба звярнуць на наступнае.

Асаблівай чысцінёй, паэтычнасцю прасякнуты ўзаемаадносіны дзяўчынкі з прыродай. Падзеі адбываюцца ў першыя пасляваенныя гады. У цэнтры аўтарскай увагі гісторыя, якая здарылася з дванаццацігадовай Іркай, дачкой лесніка. Іх сям'я жыве ў лесе, які дзяўчынка любіць і добра ведае. Неяк зімою яна сустракае аленяў, узбуджаная, доўга бяжыць за імі. Пазней тыя алені панадзіліся прыходзіць да леснікавага стажка сена. Ірка пасябравала з імі, прыносіла старому аленю пачастункі. Але бацька з Язэпам, рыжым і злосным чалавекам, аднойчы забіваюць старога аленя. І жывёлы да стажка больш не прыходзяць. Дзяўчынка шукае іх, балюча перажывае страту.

Потым у Іркі было запаленне лёгкіх. Гэта апошняя падзея твора надае апавяданню, вельмі лірычнаму паводле эмацыянальнага напаўнення, моцнае драматычнае гучанне.

Такі падзейны бок апавядання. Звычайная жыццёвая гісторыя. Ці мала такіх здараецца ў жыцці? Ды і ці так ужо страшна, што ў галодны час ляснік і Язэп забіваюць аленя? Дапушчальная і такая логіка, калі пра ўсё гэта разважаюць наогул, па-за кантэкстам, безадносна да ўсёй мастацкай сістэмы твора, яго эмацыянальнага напаўнення. Але твор мастацтва заўсёды трансфармуе рэальны жыццёвы факт: надае яму іншую мастацкую прастору, глыбіню, логіку і паслядоўнасць развіцця і, нарэшце, новае своеасаблівае гучанне, адметны, ужо чыста мастацкі змест. Менавіта гэты змест, гэты сэнс цікавіць і хвалюе чытача ў творы мастацтва.

У апавяданні І. Пташнікава гісторыя, што адбылася з дванаццацігадовай Іркай і аленямі, насычана глыбокімі і чыстымі пачуццямі, сапраўднай паэтызацыяй

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

адносін чалавека да прыроды. Забойства аленя для Іркі не было б такім балючым, такім па-сапраўднаму трагічным, калі б пісьменнік не паказаў тонка і глыбока натуральнасць і паэтычнасць, высокую жыццятворнасць узаемадачыненняў дзяўчынкі з прадстаўнікамі жывёльнага свету.

Ірка бачыць, чым і як жыве прырода. У лесе для дзяўчынкі, здаецца, няма нічога невядомага, для яе гэта асвоеная прастора — дом. Ірка ўсё заўважае, бачыць, жыва адчувае.

Так бачыць прыроду, адчуваць яе можна толькі тады, калі любіш яе, захапляешся ёю, калі яна — гэта ты, аснова цябе, калі ты нібы выходзіш з яе і ўсё з ёй да драбніц табе знаёмае, ды не ўсё тваё. Сустрэча з аленямі, сяброўства з імі — для Іркі нешта зусім новае ў яе ўзаемаадносінах з навакольным светам. Гераіня апавядання «Алені» І. Пташнікава адчула яго даверлівасць, любоў.

Жывая прырода выконвае важную ролю пры мастацкім адлюстраванні жыцця. Як зазначае С. Андраюк, у творчасці І. Пташнікава адбываецца пастаяннае, шматбаковае, шматаспектнае ўзаемадзеянне чалавека з навакольным светам: «З абставінамі першага, бліжэйшага плану (прырода, побыт, асабістыя ўзаемаадносіны, праца) — непасрэднае, шырокае, асабліва моцнае і інтэнсіўнае. З абставінамі ж другога, вышэйшага плану (грамадска-сацыяльнымі) — больш апасродкаванае, дзесьці як бы выбіральнае. Пры чытанні ствараецца ўражанне, што абставіны вышэйшага плану шмат у чым нібы паглынаюцца абставінамі першага плану, якія ў выніку набываюць большую шчыльнасць, глыбіню, маштабнасць» [1, с. 11].

У «Аленях» вялікая ўвага надаецца пытанню аховы прыроды, што з'яўляецца адным з аспектаў выхавання эмпатыі. У цэлым у сваіх творах І. Пташнікаў кожны раз акцэнтуе ўвагу на тым, што гінуць жывёлы не самі па сабе, а па віне чалавека (браканьерства). Разуменне гэтага факта стварае своеасаблівы дыскамфорт у дзіцячым успрыманні свету. Настаўніку трэба дапамагчы шасцікласнікам спраецыраваць боль, які адчувае жывёла і галоўная гераіня Ірынка, на сябе, адчуць канфліктнае сутыкненне гуманістычнай скіраванасці (тое, што закладзена ў вучняў раней) на аб'екты прыроды і абмаляванага ў творы адваротнага працэсу. Гэта дасягаецца ў працэсе рэпрадукцыйнай гутаркі па апавяданні*, а таксама ў працэсе выканання творчых заданняў, рэфлексіі.

Вывучаючы літаратуру па сістэме перспектыўных ліній, можна даць дзецям заданне напісаць міні-сачыненне тыпу «Як я дапамог жывёле», «Жывёлы — нашы памочнікі», «Як дапамагчы птушкам перазімаваць». Таксама можна прапанаваць прыдумаць працяг апавядання «Алені», зарыентаваўшы шасцікласнікаў на адлюстраванне лёсу Ірынкі, калі яна стала дарослай (у выглядзе міні-сцэнкі, стварэння кадраплана і інш.).

У якасці дамашняга задання можна прапанаваць дзецям занатаваць свае пачуцці, якія ўзніклі пры чытанні твора, на паперы ў выглядзе малюнка. Акрамя таго, зрабіць запісы, якімі эпітэтамі можна апісаць аленя, якімі — стан Ірынкі ў час гульні з аленямі і калі алені перасталі да яе прыходзіць, якімі словамі можна апісаць стан бацькі Ірынкі. Падобным заданнем рэфлексійнага характару адлюстроўваюцца рэальныя ацэначныя пазіцыі школьнікаў.

Як у прыродзе, так і ў грамадстве існуе ўзаемасувязь усяго і ўсіх; кожная клетачка, кожная ячэйка нясе ў сабе ўласцівасці, тэндэнцыі і законы вялікага свету жыцця чалавека, свету прыроды.

---

* Можна выкарыстаць пытанні, прапанаваныя ў вучэбным дапаможніку: Беларуская літаратура. 5 (6) клас / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. — Мінск: Нар. асвета, 2003.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У гэтым апавяданні, мабыць, упершыню ў творчасці пісьменніка так этычна аголена выявіўся цэнтральны для яго творчасці (а то і для ўсёй сучаснай літаратуры) канфлікт, а менавіта — вострая, непрымірымая барацьба розных адносін да жыцця, да навакольнага свету, найперш да прыроды — прагматычна-спажывецкіх (утылітарных) і бескампрамісных, творча-паэтычных.

У гэтым выпадку духоўную каштоўнасць чалавека І. Пташнікаў бачыць у яго прыроднай чалавечай сутнасці. Узрост у Іркі такі, што яна блізкая да паэтычнага ўспрыняцця прыроды. Рэальнасць і фантазія тут як бы зліваюцца, становяцца нечым адзіным, неабходным для сапраўднага чалавечага жыцця.

У «Аленях» І. Пташнікава адносіны да навакольнага свету па-дзіцячы светлыя і чыстыя, эмацыянальна-інтуітыўныя, акунаюць нас у атмасферу чагосьці паэтычна-таямнічага, вылучаюцца высокай этычнасцю, чысцінёй.

Такім чынам, з адзначанага вышэй можна зрабіць наступныя высновы.

*Па-першае,* эмпатыя займае важнае месца ў сістэме выхавання гуманістычных пачуццяў падрастаючага пакалення.

*Па-другое,* анімалістычныя вобразы — гэта той фактычны матэрыял, які мае багатыя патэнцыяльныя магчымасці для фарміравання традыцыйнай сістэмы маральна-этычных каштоўнасцяў чалавека ў кантэксце эмпатыйнага выхавання.

*Па-трэцяе,* пры вывучэнні апавядання І. Пташнікава «Алені» ў VI класе неабходна надаваць належную ўвагу магчымасці праецыравання адчуванняў галоўнай гераіні на ўласны эмацыянальны стан вучняў, а таксама на адчуванне таго болю, той гамы пачуццяў (здрада), што перажываюць алені як прадстаўнікі жывёльнага свету (анімалістычныя вобразы).

### Літаратура


1. *Андраюк, С.* Чалавек на зямлі: нарыс творчасці І. Пташнікава / С. Андраюк. — Мінск: Маст. літ., 1988. — 252 с.
2. *Бельскі, А.* Свет ад травы да зор: Беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: дапам. для настаўнікаў / А. Бельскі. — Мінск: Нар. асвета, 1998. — 223 с.
3. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. шк. з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. — Мінск: Нар. асвета. — 399 с.
4. *Козіч, В. І.* Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе / В. І. Козіч. — Мінск: Беларус. навука, 1998. — 94 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова